УДК 947.6

# РЭЛІГІЙНАЕ ЖЫЦЦЁ ЯЎРЭЯЎ БЕЛАРУСІ Ў 1970–1985 гг. ПАД УПЛЫВАМ ШАСЦІДЗЁННАЙ ВАЙНЫ

**Пушкін Ігар Аляксандравіч**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт харчовых і хімічных тэхналогій
(г. Магілёў, Беларусь)

*Асвятляецца рэлігійнае жыццё яўрэяў БССР у 1970-1985 гг. пад уплывам вынікаў шасцідзённай вайны 1967 г.: колькасць веруючых прысутных падчас асноўных рэлігійных святаў; па-за культавая дзейнасць вакол сінагог і рэакцыя афіцыйных уладаў на яе.*

У канцы 1960-х – пачатку 1970-х гг., у сувязі з падзеямі на Бліжнім Усходзе, асабліва пасля заканчэння пераможнай для Ізраіля шасцідзённай вайны (1967 г.), у Савецкай Беларусі павялічылася цікавасць да сінагогі ў яўрэйскай моладзі і асобаў з сіяністкімі поглядамі. У рэспубліцы пачалі дзейнічаць нелегальныя гурткі па вывучэнню іўрыта, гісторыі яўрэйскага народа і яўрэйскай філасофіі, распаўсюджваўся самвыдат, у Мінску працаваў культурна-гістарычны семінар [3, с. 225]. Сталі больш актыўна ствараліся міньяны, дзе на малітоўныя сходы збіраліся да 30–40 чал. [6, арк. 57] Гэта моцна усхвалявала кіраўніцтва БССР. Упаўнаважаны савета па БССР накіраваў 16.03.1970 г. сакрэтны цыркуляр, у якім прадпісвалася упаўнаважаным абласных саветаў: “Там дзе маюцца групы (міньяны), неабходна ўсталяваць назіранне за падрыхтоўкай і правядзеннем дадзеных святаў. У сувязі з абвастрэннем становішча на Блізкім Усходзе і актывізацыяй міжнароднага сіянізму, прашу Вас усімі даступнымі сродкамі вывучыць настрой вышэйпаказаных яўрэйскіх груп і інфармаваць нас” [5, арк. 70].

Для выканання былі мабілізаваны шэраг службоўцаў і супрацоўнікаў органаў унутраных спраў. Па выніках праведзенай працы выканаўчы камітэт Магілёўскага абласнога савета дэпутатаў 25.03.1970 г. адрапартаваў: “Упаўнаважаны савета па Магілёўскай вобласці паведаміў старшыням райгарвыканкамаў пра яўрэйскае рэлігійнае свята Пурым з просьбай арганізаваць назіранне за міньянамі і па магчымасці вывучыць настрой яўрэйскіх груп, якія дзейнічаюць у гарадах Бабруйску, Магілёве, Шклове, Мсціславе і іншых месцах. 22 сакавіка прадстаўнікі гаррайвыканкамаў наведалі адрасы, якія з’яўляюцца месцам зборышчаў вернікаў



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

іудзейскага веравызнання, але ў гэты дзень малітоўных збораў не праводзілася. Высветлена, што яўрэі адзначалі Пурым 20 сакавіка. Шмат вернікаў яўрэяў адзначалі гэта свята ў сямейным крузе, асобныя наладжвалі вечарыны, на якія запрашалі сваякоў і знаёмых" [5, арк. 94].

У той час у савецкім друку, па радыё і тэлебачанню даваўся "адпор міжнароднаму сіянізму", выкрывалася "правакацыйная дзейнасць кіраўнікоў дзяржавы Ізраіль", накіраваная на перасяленне яўрэйскага насельніцтва з СССР на "запаветную зямлю". Гэта аказала істотны ўплыў на веруючых. У г. Бабруйску супрацоўнікі міліцыі і члены камісіі садзейнічання па кантролю за выкананнем заканадаўства аб рэлігійных культах пры гарвыканкаме выявілі, што свята Пурым яўрэі ў міньянах не адзначалі з-за страху аб магчымых рэпрэсіях. Участковы ўпаўнаважаны міліцыі ў сваім рапарце на імя намесніка старшыні Ленінскага раёна г. Магілёва паведамляў пра свае назіранні за міньянам, які знаходзіўся ў прыватнай хаце па 1-му Крутому завулку: "З лютага 1970 г. яўрэі ў гэтай хаце не збіраюцца. У выніку апытання суседзяў было выяўлена, што гаспадар хаты казаў: "Голда Меір нарабіла шмат шуму, як бы гэта ўсё не абярнулася супраць нас. Нашы маленні могуць разглядацца інакш, дык лепш пакуль маліцца па адным" [9, с. 302; 5, арк. 95].

У 1970-я гг. пад час рэлігійных святаў у Мінску колькасць наведвальнікаў сінагогі не перавышала 300 чал. Характарызуючы рэлігійную сітуацыю ў рэспубліцы за 1976 г., упаўнаважаны Савета па справах рэлігій пры Савеце Міністраў СССР па БССР адзначаў, што ў 1976 г. менш было багамольцаў у такія рэлігійныя святы, як Рош-Ашона, Іом-кіпур, Сімхат-тора, а максімальная колькасць веруючых у сінагоге не перавышала 300 чалавек старэйшага ўзросту [3, с. 226]. Для святкавання Новага году, Іом-Кіпура ў 1978 г. у сінагогу Мінска зайшло ўсяго каля 250-300 чал. У той жа час адзначаліся факты наведвання караімамі БССР на рэлігійныя святы іўдзейскай рэлігійнай абшчыны ў г. Тракай Літоўскай ССР [2, арк. 49].

Пры гэтым павялічвалася колькасць тых, хто ніякага ўдзелу ў маленнях не прымалі. Яны актыўна ўдзельнічалі ў размовах на двары сінагогі. Асобы яўрэйскай нацыянальнасці абменьваліся навінамі аб яўрэях, якія выехалі ў Ізраіль, чыталі іх лісты, перапісвалі адрасы. Іншыя кансультаваліся аб парадку афармлення дакументаў на выезд [8, арк. 89-90]. На думку ўладаў актыўнасць яўрэяў набывала не рэлігійны, а палітычны кірунак. Асабліва агітацыйна-прапагандысцкая дзейнасць "мясцовага сіяніста" – былога падпалкоўніка савецкага войска [7, арк. 95-96]. У размове з супрацоўнікам апарата ўпаўнаважанага па справах рэлігій ён заяўляў: "У нашай краіне квітнее антысемітызм. Яўрэяў не прымаюць на працу, гоняць з камандных пасадаў у войску". Маладзён, які стаяў побач заявіў: "Я скончыў палітэхнічны інстытут і працую толькі таму, што ў мяне маецца моцнае пратэжэ. А вось паспрабуйце ўзяць мой дыплом і пашпарт, вас нідзе не прымуць на працу" [6, арк. 71].

Кіраўніцтва рэспублікі пільна адсочвала настроі і памкненні яўрэяў. За вывучэнне і распаўсюджванне сіяністкай літаратуры па ўказанні КДБ БССР былі звольнены з працы ў 1969 г. два выкладчыкі Беларускага палітыхнічнага інстытута, начальнік тэхнічнага аддзелу інстытута "Энергасеткапраект" і іншыя. Пільна сачылі за студэнтам Мінскага медыцынскага інстытута, які рэгулярна наведваў сінагогу і выкладаў іўрыт для тых, хто рыхтаваўся выехаць у Ізраіль. Акрамя таго ён добра валодаў



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

англійскай, іспанскай, французскай мовамі. Не засталіся па-за ўвагаю і тыя, хто наладзіў у лютым 1971 г. у Мінску дэманстрацыю каля будынка МУС Беларусі з патрабаваннем адпусціць іх у Ізраіль [8, арк. 89-90; 9, с. 304].

Паступова адбывалася памяншэнне колькасці веруючых сярод яўрэйскага насельніцтва БССР з-за натуральных прычынаў (сталы ўзрост вернікаў) і масавага ад'езду ў Ізраіль. У 1979 г. святкавалі іўдзейскую Пасху ў Мінске, Бабруйске, Оршы, Пінске, Гомелі і інш., але прысутнічала невялікая колькасць вернікаў сталага ўзросту. У Мінскай сінагоге было толькі 130 чал., у Бабруйскай – 32 чал. [1, арк. 27-28] Яшчэ больш нізкая наведваемасць сінагогі ў Мінску адзначалася ў 1983 г. Напярэдадні свята малілася 35 мужчын і 5 жанчын, у першы дзень Пасхі ў сінагозе было каля 100 чал., у апошні – 50 [4, арк. 64].

Такім чынам, шасцідзённая вайна аказала істотны ўплыў на жыццё яўрэйскага насельніцтва Савецкай Беларусі. Адбылося абуджэнне нацыянальнай самасвядомасці ў амаль цалкам асіміляваных савецкіх яўрэяў, узнікненне яўрэйскага нацыянальнага руху ў БССР. Але павялічэнне цікавасці моладзі да сінагогі ў час іўдзейскіх святаў, шырокае вывучэнне іўрыта, дзейнасць сіяністкіх груп і інш., не мелі непасрэднага дачынення да рэлігіі. Усё было скіравана на выезд яўрэяў у Ізраіль.

## Літаратура


1. Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. – Ф. Р-6991. Воп. 6. Спр. 1558.
2. Літоўскі цэнтральны дзяржаўны архіў (Lietuvos centrinis valstybės archyvas). – Ф. R-181. Воп. 3. Спр. 102.
3. Мазец, В. Асіміляцыя нацыянальных меншасцяў у БССР у 1945–1985 гг. як вынік дзяржаўна-нацыянальнай палітыкі / В. Мазец // Репрессивная политика советской власти в Беларуси: сб. науч. работ. Вып. 3 / сост. И. Кузнецов, Я. Басин; науч. ред. В. П. Андреев. – Минск, 2007. – С. 207–238.
4. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 4 п. Воп. 151. Спр. 56.
5. НАРБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 19.
6. НАРБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 35.
7. НАРБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 36.
8. НАРБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 52.
9. Пушкін, І. А. Грамадская і культурна-асветніцкая дзейнасць нацыянальных меншасцей у Беларускай ССР (1919–1991) : манаграфія / І. А. Пушкін. – Магілёў : МДУХ, 2018. – 423 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова